вуліца – Царкоўная, а вуліцы Заблоцкая і Кушнерская сталі называцца Ружанскуй і Слонімскай [4]. Інвентар 1815 г. адзначае тры новыя вуліцы: “над выгонам” і “за кафенхаўзам”, “в тыле над выгонам” [5], а ў інвентары 1835 г. з’яўляецца яшчэ вуліца “конскі рынак”. У 1897 г. у матэрыялах перапісу насельніцтва ўзгадваецца вуліца Малінавая, а таксама Агародны і Вакзальны завулкі [6, с. 147]. Вулічная сетка мястэчка ў канцы XIX ст. складалася з рынку і 13 вуліц, а галоўнымі былі вуліцы Гродзенская, Слонімская і Ружанская.

Першы вядомы нам спіс жыхароў Зэльвы ўтрымлівае інвентар 1616 г. Поводле яго дадзеных у мястэчку налічваліся 103 сям’і [2]. Інвентар 1633 г. адзначыў наяўнасць ужо 125 сем’яў [3]. Адносна наступных 150 гадоў падобнай інфармацыі, на жаль, няма.

Рэвізкая сказка 1795 г. налічвае ў Зэльве 74 хрысціянскія сям’і і 293 душы абодвух палоў [7]. Паводе рэвізкага перапісу 1816 г. у мястэчку налічвалася ўжо толькі 40 хрысціянскіх двароў і 193 жыхара. Магчыма, такое радыкальнае скарачэнне хрысціянскага насельніцтва было выклікана падзеямі вайны 1812 г.[8]. Паводле інвентара 1815 г. у Зэльве налічвалася 116 яўрэйскіх двароў [5]. У 1829 г. у Зэльве налічваўся 161 двор, з якіх 63 – хрысціянскіх, 98 – яўрэйскіх. Паводле дадзеных усеагульнага перапісу насельніцтва 1897 г. у Зэльве складала 2802 асобы, сярод якіх 1361 мужчынскага полу і 1441 жаночага полу [6, с. 147]. Большасць складалі яўрэі – 1844 асобы.

**Літаратура**


1. *Гардзееў, Ю.* Магдэбурская Гародня. – Wrocław: Wrocławska Drukarnia Naukowa, 2008. – 383 с.
2. Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага дзяржаўнага універсітэта. Фонд 4. Адзінка захавання 34386. Інвентар Зэльвы 1616 г. – 33 л.
3. Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага дзяржаўнага універсітэта. Фонд 4. – Адзінка захавання 34367. Інвентрат Зэльвы 1633 г. – 44 л.
4. Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага дзяржаўнага універсітэта. Фонд 4. – Адзінка захавання 34385. Інвентар Зэльвы 1785 г. – 14 л.
5. Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага дзяржаўнага універсітэта. Фонд 4. – Адзінка захавання 34391. Інвентар Зэльвы 1815 г. – 54 л.
6. *Токць, С. М.* Насельніцтва мястэчка Зэльва ў матэрыялах перапісу 1897 г. // Славуты зэльвенскі край. – Ліда, 2004. – С. 147-151.
7. Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага дзяржаўнага універсітэта. Фонд 4. – Адзінка захавання 39727 (А - 1447). Рэвізская сказка Зэльвы 1795 г.
8. Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага дзяржаўнага універсітэта. Фонд 4. – Адзінка захавання 34030 (А - 1141). Рэвізская сказка Зэльвы 1816 г.


©ГДУ

## ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНАЯ СПАДЧЫНА ЛЕЛЬЧЫЦКАГА РАЁНА: РЭГІЯНАЛЬНА-ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

***П.М. ЦАЛКА*, В.С. НОВАК**

This is a study of folklore one region. This paper addresses the following genres of folklore: calendar-ritual poetry, family ritual poetry, folk mythology, demonology. We used materials from many regional publications on folklore and ethnography, materials research laboratory of the Department of the Belarusian culture and folklore of educational establishment «Gomel State University named after F. Scorina», own record labels

Ключавыя словы: абрад, рытуал, магія, каляндарна-абрадавы фальклор, сямейна-абрадавы фальклор

Традыцыйная абраднасць Лельчыцкага раёна – самабытная з’ява, якая з’яўляецца неад’емнай часткай народнай культуры. З’яўляючыся крыніцай ведаў аб жыцці і прыродзе, эстэтычных, маральных каштоўнасцей народа, адлюстраваннем грамадска-бытавога ўкладу, працоўнай дзейнасці, абрадавы фальклор з’яўляецца важным фактарам захавання і развіцця этнічнай самасвядомасці беларусаў.

У этналогіі маецца шэраг канцэпцый аб крытэрыях класіфікацыі традыцыйных абрадаў. У прапанаваным даследаванні разглядаюцца каляндарныя і сямейныя абрады, якія выяўляюць цесную сувязь з працоўнай дзейнасцю і грамадскім жыццём жыхароў дадзенага раёна. Прааналізаваны намі фальклорны матэрыял, дае падставы сцвярджаць, што ля вытокаў усіх грамадскіх і сямейных святочных абрадаў беларусаў знаходзіцца працоўная дзейнасць нашых продкаў (земляробства і жывёлагадоўля). Земляробства спрадвеку было асноўным заняткам беларусаў, таму абрады земляробчага цыкла займалі вядучае месца ў культуры і пэўным чынам адлюстроўваліся ў розных відах абрадавага фальклору.

Ва ўсіх традыцыйных святах беларускага народа мы знаходзім арганічнае спалучэнне хрысціянскіх і язычніцкіх элементаў.

Народныя святы Беларусі былі цесна звязаныя з яе жыццёвым укладам. Яны прыцягвалі людзей не толькі сваім магічна-утылітарным прызначэннем, але і відовішчнасцю, цікавасцю да рытуалаў і

песенных тэкстаў, жаданнем кожнага чалавека павесяліцца, паказаць свае здольнасці ў скоках, карагодах, песнях. Землянробчыя і сямейныя святы поўнасцю адзначаліся прыкладна да пачатку XX стагоддзя і з'яўляліся своеасаблівымі вехамі, якія дзялілі працоўны год і жыццё селяніна на пэўныя вызначаныя перыяды. Зараз яны страцілі гэтую функцыю рэгулятара працоўных працэсаў, іх колькасць нашмат скарацілася. Шматлікія традыцыйныя святы зараз пераўтвараюцца ў святы провадаў зімы, сустрэчы лета, Новага года, свята ўраджаю і г.д. Яны ператварыліся ў чыста пацешлівыя дзеянні або нават у дзіцячыя забавы. Стары магічны сэнс абрадаў і спрадвечная жыццесцвярджальная аснова абрадаў забываюцца.

Зыходзячы з прыведзенымі у дадзеным даследаванні звесткамі пра бытаванне традыцыйнай культуры на тэрыторыі Лельчыкага раёна можна вызначыць наступнцыя яе асаблівасці:

Паводле этнаграфічных звестак, у выкананні абраду гукання вясны на тэрыторыі Лельчыцкага раёна вылучаецца некалькі асноўных часавых межаў правядзення – Стрэчанне і Вялікдзень. Адзначым, што ў якасці месцаў абраду гукання вясны выбіраліся гара, дрэва, стог сена, "поды" стагоў. Акрамя песень-вясназнак, хутчэйшаму надыходу вясны, паводле меркаванняў мясцовых жыхароў, спрыяла выпечка абрадавага печыва – птушачак, якіх дзяўчаты і хлопцы падкідвалі ўверх, а таксама пакідалі на ўзвышаных месцах. Галоўная мэта ўсіх абрадавых дзеянняў веснавога цыкла – паскорыць надыход вясны пры дапамозе выканання песень-вяснянак, рухаў (шэсці па вёсцы, карагоды) і прадметнай атрыбутыкі (елка, птушкі з цеста і інш).

Паводле запісаў, зробленых у 2009 годзе падчас адной з уласных экспедыцый, вынікае, што гукалі Вясну ў вёсках Лельчыцкага раёна аж тры разы. Першы – на «Стрэчанне» (15 лютага), другі – на другі дзень Вялікадня (кожны год дата розная) і трэці раз – на «Саракі» (22 сакавіка). Заслугоўваюць увагі сведчанні саміх інфармантаў: «Весну гукаць хадзілі на Стрэчанне, 15 феўраля празнік Стрэчанне. Мы хадзілі, усе такіе дзевачкі, по дзвенаццаць, по дзесяць год, большые і меншые, розные. І кругом дзярэўні з ёлкою нарожджоною ходзілі. Ёлка така ото, тады ж цацок не було, а з бумажок паробімо. І хадзілі тры раз вокруг дзярэўні сустрэкаць весну» [Р. Я. Дз.]. У прыведзеных этнаграфічных звестках вельмі цікавым з'яўляецца факт «трайнога» абыходу вёскі. Магічная лічба тры ўказвае на тое, што гэта быў не проста абыход дзеля весялосці, а своеасаблівы зварот да звышнатуральных сіл, якія былі закліканы садзейнічаць хутчэйшаму прыходу вясны. Аналіз зафіксаваных палявых матэрыялаў дае падставы сцвярджаць факт наяўнасці язычніцкіх элементаў: абыход вёскі («па колу») сімвалізаваў, можна меркаваць, зварот да сонца. У гэтых адносінах «… кола – наводзіць на думку пра салярны культ» [1, с. 20].

У мясцовым абрадзе гукання вясны важнае месца адводзіцца прадметнай атрыбутыцы – абрадаваму дрэву – ёлцы, якое з'яўляецца сімвалам вечнага жыцця. Так, вечназялёны колер дрэва дазваляе гаварыць аб неўміручай яго сіле. Але вядомы факт, што іншы раз у народзе ёлку адносілі да «нядобрага» дрэва, якое можа прынесці смерць у двор, дзе яго пасадзілі: «Ёлку не можна садзіць кала хаты, як яна перарасце вільчыкам хату, то абязацельно нехто памрэ ў етай хаці» [К. В. М.]. Удзельнікі «траістага абыходу вёскі» маглі палохаць зіму, з аднаго боку, жыццёвай сілай гэтага дрэва, а з другога боку – тым «нядобрым знакам», якім яно сімвалічна пазначана ў народзе. Ёлку можна разглядаць таксама як своеасаблівы медыятар паміж мінулым і будучым. Вядома, што як прадметны атрыбут ёлка выкарыстоўваецца і ў вясельным цыкле абрадаў: «На свадзьбу подружкі молодое ўсегда рабілі елачку» [Ф. Н. М.]. Маладая дзяўчына (нявеста), толькі пасля таго як сваты («дружкі») выкупяць елку, магла пакінуць бацькоўскую хату і «перайсці да свайго мужа»: «По елачку подружкі молодое ходзілі ў лес. Прынесуць ее і ўжэ ўсякім цвятамі з бумагі ўкрашалі, і зверху ўжэ, напрымер, вешалі цэну. І от дружкі зразу даўжны булі вукупіць платочкі, кожны ў свае подружкі, а потом ужэ старшы сват вукупліваў ёлку. І тады ужэ яны маглі пабачыць молоду» [А. В. Дз.]. У вышэйназваных вёсках Сіманічы і Сіманіцкая Рудня, як ужо адзначалася, пачыналі гукаць вясну на Стрэчанне. Яскравым пацвярджэннем таго, што людзі гэты дзень уяўлялі як дзень спаборніцтва вясны і зімы, з'яўляецца наступная прыкмета: «Ек на Стрэчанне певень з-пуд страхі нап'ецца, то весна пабедзіла зіму і ўжэ скоро трэба ждаць цепла» [Ф. Н. М.]. Наступным аргументам, які паказвае, што гэты дзень ў свядомасці людзей уяўляўся не проста як дзень спаборніцтва, а нават як дзень своеасаблівай «вайны» паміж зімой і вясной можа паслужыць наступная песня, якая выконвалася падчас абыходу вёскі гуртом маладых дзяўчат:

Ой, зіма з летом стрэкаецца,
Король на войну ўбіраецца… [Р. Я. М.].

У першых радках дадзенага песеннага тэксту яскрава прасочваецца матыў так званай «вайны». Але ж яшчэ цікавейшы падтэкст гэтай песні: гэту своеасаблівую «вайну» павінны весці не мужчыны, а жанчыны, бо, зыходзячы са зместу твора, кароль павінен вярнуцца «дадоманьку». Пацверджанне гэтай думкі можна знайсці і ў той знакавай асаблівасці, што гукаць вясну хадзілі толькі дзяўчаты: «Хадзілі ўсе такіе дзевачкі по дзвенаццаць, по дзясець год, большые і меншые, розные» [Р. Я. Дз.]. Заключным этапам гукання вясны на Стрэчанне было калектыўнае гулянне: «А после етаго (трайнога абыходу вакол вёскі з песнямі – Ц.П.) сабіраемса ў адну, дзе больша, хату. Хто што прынесе, тады ж не було чаго есці пасля вайны, хто пшана, хто картошкі, хто што. Хлеба не було вообшчэ. Ну, от так ото ў той хаці сабіраемса. Паселі ўжэ, паелі. Водкі тады не знаў ніхто, шо ето таке – квас. От попілі ўжэ той квас. І ўжэ танцы да самаго да утра ўжэ ў нас» [Р. Я. Дз.]. Гэты этап, на мой погляд, звязаны з такой сацыяльнай з’явай, як стварэнне новай сям’і. У гэты вечар хлопцы і дзяўчаты мелі магчымасць пазнаёміцца адзін з адным, паказаць свае здольнасці ў гатаванні ежы, у выкананні песень, у харэаграфічных здольнасцях. Як вядома, сярод сялян асноўным крытэрыем выбару сабе пары, мужа або жонкі, раней было не матэрыяльнае становішча (ніякага вялікага дастатку ў сялян не было), а спрыт і майстэрства чалавека. І таму на вячорках і хлопцы, і дзяўчаты стараліся паказаць усе свае здольнасці.

Да наступнага, вылучанага намі, этапа гукання вясны можна аднесці свята Саракі, якое адзначаецца 22 сакавіка. Карані гэтага свята можна шукаць і ў хрысціянскай, і ў язычніцкай традыцыях. Яго хрысціянскае паходжанне заснавана на тым, што у гэты дзень у 313 годзе ў армянскім горадзе Севасцій былі пакараны сорак воінаў-хрысціян, якія адмовіліся перад паходам прынесці ахвяру паганскім багам. Каб зламаць іх волю іх прымусілі адмовіцца ад Хрыста. Воінаў вывелі на лёд возера ў люты мароз, але лёд растаў, а над галовамі мучанікаў з’явіліся светлыя вянцы. Тады воінаў забілі палкамі да смерці, а целы спалілі. Але ж у нашай палявой практыцы не знайшлося ніякіх пацверджанняў гэтай падзеі. «Лічба сорак і такая назва гэтага дня маглі прыйсці да нас з язычніцкай традыцыі, дзе менавіта такая колькасць цёмных сіл закоўвае зямлю на працягу ўсёй зімы» [2, с. 23].

Вобраз птушкі-жаваранка яскрава прасочваецца ў гэты дзень як дамінуючы сімвал. Менавіта выпяканне своеасаблівага печыва ў выглядзе птушак і з’яўляецца цэнтральным дзеяннем у абрадах, якія выконваліся ў гэты дзень: «На Саракі ўсегда пеклі жаваранкаў, такіх пцічак з цеста і ў адзін абезацельно клалі капеечку. От каму пападзе ета птушачка з капеечкаю, той будзе цэлы год шчаслівуй. Рано перад усходам сонца малые дзеці ўставалі і перакадвалі чэраз хату сорак трэсачак, каб летам найці сорак вераб’іных кублаў» [К. В. М.]. На наш погляд, менавіта сорак птушак і з’яўляліся тымі самымі звышнатуральнымі істотамі, якія сваім прылётам дапамагалі вызваліць зямлю ад вышэйназваных сарака «цёмных сіл».

У мясцовай традыцыі гукання вясны ў названых вёсках (Сіманічы, Сіманіцкая Рудня Лельчыцкага раёна) спявалі вяснянкі на другі дзень пасля Паскі (Вялікадня – Ц.П.). «У гэты дзень паводле сведчанняў Н. М. Федаровіч, 1938 г.н., жыхаркі вёскі Сіманічы, «жанкі збіраліса разам, вуходзілі на пагон (месца ў вёсцы, дзе збіралі статак свойскай жывёлы для далейшага выгану ў поле ці ў лес – звычайна канец вёскі, месца без высокай расліннасці) і спявалі веснянкі, у карагодзі хадзілі, у гульні ўсякіе гулялі» [Ф. Н. М.].

Летне-восеньскі цыкл уключае ў сябе наступныя святы: Тройца, Купалле, Пятро, Жніво (пакрыванне поля, зажынкі, уласна жніво, дажынкі), Жаніцьба коміна. У абрадавым фальклоры знайшлі адлюстраванне міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з вадой (асвячэнне і рыткальнае ўжыванне вады, купанне), зямлёй (зёлкі – асвячэнне і выкарыстанне, кветкі – выраб вянкоў, якія прадказваюцьлёс), агнём (абрадавае ачышчальнае вогнішча, якое распальвалася на Тройцу, Купалле (“Ведзьмін Іван”), “Жаніцьба коміна”). Варта адзначыць багатую тэматычную разнастайнасць жніўных песень, у якіх у асноўным распавядаецца пра незайздросны лёс жанчыны, побытавыя цяжкасці сялянскага жыцця і інш. У асноўным гэта жалобныя песні, якія суадносяцца з цяжкай працай жанчыны падчас жніва. Сваёй унікальнасцю адрозніваецца абрад “Жаніцьба коміна”, які адзначаюць у гонар запальвання першага агню ў хаце. Шматлікія абрадавыя дзеянні (карагод, абсыпанне жытам, песні ў гонар “посвета”, абрадавае частаванне) сведчаць аб значнасці вогнішча ў жыцці чалавека. Восень была тым адметная ў жыцці соцыуму і адпаведна ў народным календары, што на працягу гэтага перыяду шэраг палявых работ завяршалі гаспадарчы год земляроба і вырашалася адна з самых кардынальных сямейных праблем – вырашаўся лёс маладых людзей: абмяркоўваліся пытанні наконт замужжа дачок і жаніцьбы сыноў. З улікам таго, што сялянскія сем’і былі традыцыйна вялікімі, матрыманіяльная праблема з’яўлялася для іх архіважнай у сацыяльным і псіхалагічным планах. Вясельная традыцыя ў нашай працы займае асобны раздзел, а адметнасцю духоўнай

спрадчыны Лельчыцкага раёна можна па праву лічыць восеньскі абрад «Жаніцьба коміна», які праходзіў у в. Дзяржынск (раней – в. Радзілавічы).

«Жаніцьба коміна» – архаічны абрад, які захаваўся на тэрыторыі Палесся, а ў прыватнасці ў Лельчыцкім раёне вёска Дзяржынск (раней – в. Радзілавічы) да нашых часоў. Назва абраду ўжываецца ў некалькіх варыянтах – «жаніцьба коміна», «жаніцьба посвета (пасвета)» і «жаніцьба лучніка». Для больш глыбокага разумення абраду спачатку паспрабуем зразумець сутнасць вышэй пазначаных сінанімічных назваў. Комін – посвет (пасвет) – лучнік як словы-сінонімы не зусім супастаўляльныя, таму што комін – гэта дэталь, пры дапамозе якой выводзіцца дым з хаты, а посвет (пасвет, лучнік) – гэта дэталь, на якую кладуцца «смаляныя скепачкі», якія асвятляюць жыллё («Коміну навешваем посвет і…» [Ц. В. С.]). Зыходзчы з апісанняў комплексу можна ў гэтым абрадзе візуальна, паводле дзеянняў («коміну навешваем посвет») адбываецца злучэнне, «жаніцьба» коміна і посвета. Комін, відаць, высупае ў ролі «жаніха», а посвет – «нявесты». У той жа час, паводле зафіксаваных намі тэкстаў, відаць, што «бяруцца шлюбам» праца і комін:

Праца – дзеўка наша гарненька,
Палюбіць коміна радзенька.
Мы ж цебе будомо жэніці,
Жэніці, квас, мёд, піво піць [Ц. В. С.].

З роляй «жаніха» ўсё зразумела, хаця і не да канца (чаму «кветкамі ўбіралі, і барвеночкам нараджалі» жаніха, а не нявесту, як гэта робіцца звычайна ў вясельным абрадзе?). А вось наконт «нявесты» яшчэ трэба паразважаць: праца – тое, дзеля чаго і запальваецца комін («женітьба коміна ў нас і песні пріурочены к Семёну, потому что начінаюцца длінные осенніе вечера после летней ночі короткой, потому что ўжо работы пріблiжаецца больше» [Ц. В. С.], а посвет – металічная рашотка, патэльня на якой распальвалі лучыну для асвятлення хаты. Паводле сказанага можна зрабіць вывад, што праца і посвет (пасвет) асацыіруюцца з адной і той жа з’явай – хатнія работы, якія асвячаліся вогнішчам. Немалаважным у дадзеным абрадзе з’яўляецца і той момант, у каго будуць «жаніць комін» («свяціць комін»). Посветы раней знаходзіліся ў кожнай хаце («…колісь не было электрічества, а цёмна было. А свяцілі на посветах на лучыне» [Ц. В. С.]), але для «жаніцьбы» (асвячэння) выбіралі адзін посвет у вёсцы. Гаспадар хаты, у якой «жанілі коміна (посвета)» абавязкова быў багатым, працавітым і гасцінным: «Мы собіраемся свяціть коміна не к бедному, а к богатому, к такому у кого і мёд есць, пчеляру к тому, у кого мёд е. Ён угасціць мёдам і чарку дасць» [Ц. В. С.]. На нашу думку, выбар багатага гаспадара – гэта адзін з элементаў прадуцыруючай магіі. Жыхар выбранай хаты быў носьбітам самых лепшых якасцей (багацце, працавітасць, гасціннасць), якія перадаваліся ўсім удзельнікам абраду і жыхарам вёскі. Адмысловым, на наш погляд, быў і выбар не проста багатага гаспадара, а менавіта пчаляра, бортніка. Па-першае, гэта быў чалавек даволі аўтарытэтны ў вёсцы (спецыфічны род дзейнасці – пчалярства, бортніцтва, якім валодалі адзінкавыя людзі ў вёсцы), па-другое, паводле народных павер’яў, «пчалярства ўяўляе сабой дастаткова замкнёны культурны асяродак, які мае сакральны характар, што набліжае яго да знахарства і вядзьмарства» [3, с. 369]. Больш таго, мёд, якім пчаляр частаваў гасцей, мог успрымацца як своеасаблівая ахвяра. Бо жанчыны, якія выконвалі рытуальныя дзеянні з агульнага абрадавага комлексу мелі непасрэднае дачыненне да ўшанавання посвету, які заўжды ўспрымаўся як «месца канцэнтрацыі сямейна-родавых каштоўнасцей, крыніца жыцця і здароўя, захаванння сакральнага чыстага агню» [3, с. 39]. Менавіта еднасць посвета з вогнішчам і надзяліла яго своеасаблівай звышнатуральнай якасцю сумяшчаць «у сабе сімволіку цэнтра і мяжы» [3, с. 39]. У адрозненне ад чырвонага кута, які знаходзіцца на ўсходзе і асацыіруецца з Богам, светлымі сіламі, посвет знаходзіцца па дыяганалі, на захадзе, і з’яўляецца носьбітам язычніцкіх традыцый, якія суадносяцца з верай у цёмныя сілы. Вакол посвета, адбываецца «жаніцьба» – магічна-рытуальны копмлекс абрадавых дзеянняў, які носіць аграрна-бытавы характар: «Прыгатаваўшы ўсё неабходнае для вячэры, гаспадыня абвязвае комін і лучнік новымі ручнікамі, а моладзь прыбірае іх кветкамі. Стол накрываецца новым абрусам і ставіцца пры самай печы ці пад лучнікам. Як толькі на дварэ сцямнее, у хату збіраецца ўся сям’я…

Гаспадар гаворыць вялікае пажаданне накшталт наступнага:

«Паздароўтэ, дзедуся, бабусю, дзядзька, дзеткі, чаляднічкі, прыяцеляў і дабрадзеяў!.. Зашчытыты худобку: конькі, волыкі, кароўкі для дыток і ўсякую скаціну. Зарадыты хлебец, жыта, пшэніцю і ўсяку пашныцю…» [4, с. 286]; «…просім Бога, што благополучно провелі лето і дай, Божа,нам благополучно провесті і зімочку, штоб былі здоровые і весёлые, штоб ходіть на вячоркі» [Ц. В. С.].

Выкананне дадзеных абрадавых прамоў дае падставу сцвярджаць, што абрад «Жаніцьба коміна» быў не толькі момантам запальвання першага хатняга вогнішча і «адкрыцця» вячорак, але яшчэ пэўным чынам служыў часавай мяжой і маркіраваў заканчэнне адной пары года і пачатак другой (лета-зіма), сімвалізаваў пераход ад палявых работ (ворыва, сяўба, жніво) да хатніх (прадзенне, ткацтва).

Вясельная абраднасць Лельчыцкага раёна – своеасаблівая сістэма лакальных традыцый. Выкананне вясельных абрадаў ахоплівае шырокі часавы дыяпазон: ад месяца (сваты – вяселле – цыганы – пярэзвы) да паловы года (“оцьведы” – сваты – заручыны – запоіны – вяселле – цыганы – пярэзвы – госці). Паводле апублікаваных, архіўных і ўласназапісаных матэрыялаў можна вылучыць асобныя абрадавыя этапы, якія маюць лакальныя назвы: «Оцьведы», «Пярэпыты», «Сватанне», «Запоіны», «Заручыны», «Вянкі», «Ёлка», «Свечкі», «Каравай», «У маладога», «У дарозе», «Прыехалі да маладой», «У маладой», «Заходзяць у хату», «Пасад», «Завіваюць касу», «Падаркамі клічуць», «Перад ад’ездам да маладога», «У маладога», «Цыганы», «Госці».

Міфалагічная спадчына Лельчыцкага раёна захавала шматлікія архаічныя вераванні нашых продкаў, звязаныя з персанажамі ніжэйшай міфалогіі, анамістычнымі і татэмістычнымі вераваннямі жыхароў Лельчыцкага раёна. Шматлікія рэчы ўтылітарнага характару атаясамліваюцца як глыбока сімвалічныя і надзяляюцца магічнымі якасцямі.

Традыцыйныя звычаі і абрады, якія з’яўляюцца магутным сродкам нацыянальнага выхавання і згуртавання народа, далучэння моладзі да культуры продкаў, багатай і самабытнай, а праз гэта і да агульначалавечых каштоўнасцей, заключаюць у сабе вялікі гуманістычны патэнцыял.

Выпадзенне абрадавых каштоўнасцей з культурнага комплексу народа негатыўна сказваецца на цэласнасці этнасу, таму культуру продкаў трэба захоўваць для будучых пакаленняў.

У апошні час шмат пішуць і гавораць аб захаванні духоўнай спадчыны беларускага народа, у тым ліку яго лепшых звычаяў і традыцый. Шмат робяць у гэтым плане Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска скарыны», Інстытут нацыянальнай культуры, і іншыя ўстановы адукацыі і культуры Рэспублікі Беларусь. Галоўным на сённяшні дзень з’яўляецца вырашэнне пытанняў захавання і развіцця самабытнасці традыцый, роднай мовы, культуры беларускага народа.

**Літіратура**


1. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Белрусь. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.
2. Барташэвіч, Г. А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г. А. Барташэвіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – 184 с.
3. Славянские древности: Этнолингвический словарь в 5-ти томах, том 4 Москва: «Международные отношения», 1995. – 577 с.
4. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад., класіфікацыя, і стэматызацыя матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; Уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел. Навука, 2003. – 429 с. – (Беларуская народная творчасць).


**Спіс інфармантаў**

[А. В. Дз.] – Астаповіч Валянціна Дзмітрыеўна, 1944 г.н., в. Сіманічы Лельчыцкага раёна;
[К. В. М.] – Куціс Валянціна Мікалаеўна, 1937 г.н.. в. Сіманічы Лельчыцкага раёна;
[Р. Я. Дз.] – Ранчынская Яўгенія Дзмітрыеўна, 1937 г.н., в. Сіманіцкая Рудня Лельчыцкага раёна;
[Ф. Н. М.] – Федаровіч Ніна Мікалаеўна, 1942 г.н., в. Сіманічы Лельчыцкага раёна;
[Ц. В. С.] – Цыбульская Вольга Сяргееўна, 1933 г.н., в. Дзяржынск Лельчыцкага раёна.

©ГДУ імя Ф.Скарыны

# ВЁСКА ШАРПІЛАЎКА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 20 – ПАЧАТКУ 21 СТ.: ЭТНАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

***А.ДЗ. ЧАРНЯК,*** **А.Р. ЯШЧАНКА**

The characteristic of the village Sharpilavka of the Gomel’s region is in the article. The author describes the most important aspects of traditional forms and modern culture of rural population, also shows the content and details of their employments, dwellings, clothes and spiritual life

Ключавыя словы: вёска Шарпілаўка, заняткі, жыллё, адзенне, духоўная культура

Актуальнасць тэмы абумоўлена важнасцю вызначэння лакальных асаблівасцей развіцця насельніцтва Беларусі на сучасным этапе, неабходнасцю стварэння этнаграфічнай характарыстыкі не толькі традыцыйных, але і новых гаспадарчых заняткаў, апісання эвалюцыі матэрыяльнай культуры і духоўных традыцый вясковага насельніцтва. Аб’ектам даследавання з’яўляецца вёска Шарпілаўка Гомельскага раёна ў другой палове 20 – пачатку 21 стагоддзя. Прадметам вывучэння выступае культура жыхароў дадзенага населенага пункта. Мэта працы - этнаграфічная характарыстыка вёскі